БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай
рабоце
________________ А.Л. Толсцік
27 ________ 2016 г.

Рэгістрацыйны № УД-3082/ вуч.

# ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАЯ КРЫТЫКА

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі**
**па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці**
**1-23 01 10 "Літаратурная работа (па напрамках)",**
**напрамак спецыяльнасці**
**1-23 01 10-01 "Літаратурная работа (творчасць)"**

2016

Вучэбная праграма складзена на аснове АСВА 1-23 01 10-2013, тыпавой праграмы для ўстаноў вышэйшай адукацыі № ТД-Е.503/тып. ад 22.04.2013, вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі № Е 23-269/вуч., зацверджанага 29.05.2015.

**Складальнік:**

*Кавалеўскі Арцём Мікалаевіч*, старшы выкладчык кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

Кафедрай літаратурна-мастацкай крытыкі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(пратакол № 18 от 29.06.2016);

Навукова-метадычным саветам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(пратакол № 7 ад 30.06.2016 г.).

ЗАГ. КАФЕДРЫ__________________________Саянкова-Мельніцкая Л.П.

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма па дысцыпліне «Літаратурна-мастацкая крытыка» распрацавана для вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь згодна з патрабаваннямі адукацыйных стандартаў па спецыяльнасці 1-23 01 10-01 «Літаратурная работа (творчасць)».

Курс тэорыі і метадалогіі літаратурна-мастацкай крытыкі – важны кампанент падрыхтоўкі будучых журналістаў. Журналіст павінен **мець** навык прафесійнай ацэнкі і аналізу мастацкіх твораў, якія складаюць неад’емную частку культурнага набытку як асобнага чалавека, так і грамадства наогул.

Агульную **накіраванасць** вучэбнай дысцыпліны складае вызначэнне сістэмы, метадаў і прынцыпаў, якія б садзейнічалі як крытычнаму, так і міждысцыплінарнаму падыходу пры разглядзе мастацкага твора. Гэта прадугледжвае выяўленне і выпрацоўку тыпалогіі інтэрпрэтацыйных мадэлей мастацкага твора ў сістэме асноўных крытычных жанраў, што дапаможа вылучыць і сістэматызаваць як агульныя, так і спецыфічныя рысы разнастайных канцэпцый у айчынным мастацтвазнаўстве. Даследаванне падыходаў да аналізу твораў мастацтва дазваляе стварыць цэласную карціну сумежнага тэарэтычнага поля класічнага мастацтвазнаўства і сучаснай крытыкі і на аснове гэтай карціны разгледзець мастацкі твор як складаную шматузроўневую з’яву, у якой кожнаму элементу адведзена важная роля ў стварэнні гарманічна ўпарадкаванага мастацкага адзінства.

Вучэбная дысцыпліна **прадугледжвае** спалучэнне тэарэтычных ведаў з самастойнай практычнай дзейнасцю студэнтаў (напрыклад, напісанне літаратурна-крытычных работ у розных жанрах).

У сувязі з тым, што літаратура і мастацтва займаюць важнае месца ў сацыякультурным жыцці чалавека, дысцыпліна «Літаратурна-мастацкая крытыка» адыгрывае значную **ролю** ў падрыхтоўцы спецыялістаў гуманітарнай сферы наогул і асабліва ў падрыхтоўцы тых спецыялістаў, адной з важных задач прафесійнай дзейнасці якіх з’яўляецца комплексны аналіз, вытлумачэнне і інтэрпрэтацыя твораў мастацтва і прыгожага пісьменства. Гэтая дысцыпліна ўваходзіць у цыкл спецыяльных дысцыплін дзяржаўнага кампанента і займае важнае **месца** ў падрыхтоўцы спецыялістаў дадзенага профілю. Вучэбная дысцыпліна «Літаратурна-мастацкая крытыка» ўзаемадзейнічае **з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі** (Ттэорыя літаратуры», «Беларуская літаратура», «Руская літаратура», «Замежная літаратура», «Культуралогія» і інш.), якія спрыяюць разуменню мастацтва і літаратуры, а таксама садзейнічаюць паглыбленаму трактаванню мастацкага твора як складанаарганізаванай вобразнай і светапогляднай сістэмы.

**Мэта** дадзенай вучэбнай дысцыпліны – навучыць студэнтаў абгрунтавана і комплексна ацэньваць творы мастацтва і прыгожага пісьменства, арыентавацца ў разнастайнасці іх відаў, мець уяўленні пра стылі і жанры, сур’ёзна і ўдумліва разважаць і выказвацца аб сучасных працэсах у галіне літаратурна-мастацкай творчасці, улічваючы традыцыі айчыннай крытычнай думкі і тэндэнцыі сучаснага мастацтва розных відаў.

Асноўнымі **задачамі** дысцыпліны з’яўляюцца:

- разгляд найважнейшых этапаў у гісторыі развіцця айчыннай і сусветнай літаратурна-мастацкай крытыкі;
- зварот увагі студэнтаў на крытэрыі і прынцыпы ацэнкі публіцыстычных і мастацкіх твораў;
- фарміраванне ўстойлівых уяўленняў аб аб’ектыўным і суб’ектыўным баках крытычнага выказвання;
- дэманстрацыя міждысцыплінарнага характару літаратурна-мастацкай крытыкі і яе сувязі з іншымі навукамі аб мастацкай творчасці;
- доказнае абгрунтаванне літаратурна-крытычнай дзейнасці як самаўсведамлення мастацтва (культуры).

**Патрабаванні да засваення дысцыпліны.** У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць***:

– сутнасць, ролю літаратурна-мастацкай крытыкі ў грамадстве, у мастацтве;
– функцыі і статус літаратурна-мастацкай крытыкі ў СМІ;
– віды, стылі, жанры літаратурна-мастацкай крытыкі;

***умець***:

– прафесійна ацэньваць мастацкія творы, якія складаюць неад’емную частку здабытку асобнага чалавека і грамадства ў цэлым;
– вызначаць віды, стылі і жанры літаратурна-мастацкай крытыкі;
– абгрунтоўваць ролю літаратурна-мастацкай крытыкі ў жыцці грамадства;

***валодаць***:

– спосабамі прафесійнай ацэнкі літаратурна-мастацкіх твораў;
– прыёмамі стварэння якасных крытычных твораў розных жанраў;
– навыкамі прафесійнага аналізу крытычных твораў.

**Патрабаванні да акадэмічных кампетэнцыяў спецыяліста.** Спецыяліст павінен: АК-2. Валодаць сістэмным і параўнаўчым аналізам. АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

**Патрабаванні да сацыяльна-асобасных кампетэнцый спецыяліста.** САК-3. здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

**Патрабаванні да прафесійных кампетэнцыяў спецыяліста.** Спецыяліст павінен: ПК-6. Аналізаваць і ацэньваць сабраныя дадзеныя. ПК-10. Рабіць супастаўляльна-тыпалагічны аналіз інфармацыйных рэсурсаў.

ПК-12. Карыстацца сучаснымі метадамі ў вывучэнні літаратурнага працэсу. ПК-15. Валодаць навыкамі глыбокага асэнсавання літаратурна-мастацкіх тэкстаў, разумець іх структуру і аўтарскія задачы, умець ажыццяўляць літаратурную апрацоўку журналісцкіх матэрыялаў. ПК-17. Творча прымяняць атрыманыя веды і набытыя навыкі ў прафесійнай дзейнасці.

**Патрабаванні да засваення дысцыпліны.** У выніку засваення лекцыйнага курса, удзелу ў семінарскіх занятках, вывучэння неабходнай літаратуры і азнаямлення з творамі сучаснага мастацтва розных відаў студэнт павінен арыентавацца ў крытэрыях і прынцыпах ацэнкі мастацкага твора, ведаць асноўныя мастацкія стылі, напрамкі, плыні, разумець спецыфіку нацыянальнай школы літаратурна-мастацкай крытыкі, азнаёміцца з творамі беларускіх і

сусветных крытыкаў і даследчыкаў мастацтва. Веды, атрыманыя ў працэсе вывучэння курса, дапамогуць студэнтам у будучай прафесійнай дзейнасці ў якасці крытыка, аглядальніка ў аддзеле культуры, журналіста ў спецыялізаваных СМІ па культуры, арт-журналіста, рэдактара і г.д.

**Характарыстыка рэкамендаваных метадаў і тэхналогій навучання.** У выкладанні вучэбнай дысцыпліны «Літаратурна-мастацкая крытыка» выкарыстоўваюцца наступныя метады: герменеўтычны, кампаратывісцкі, семіятычны, метад сістэмна-цэласнага аналізу. Вывучэнне дысцыпліны прадугледжвае чытанне лекцый па тэматыцы кожнага з раздзелаў і правядзенне практычных заняткаў у выглядзе дыскусій, круглых сталоў. На семінарах прадугледжваецца абмеркаванне водгукаў, рэцэнзій, творчых партрэтаў, эсэ, напісаных студэнтамі
ў залежнасці ад абранай тэмы з мэтай фарміравання навыку аналізу мастацкага твора. У ходзе вывучэння раздзелаў дадзенай дысцыпліны студэнтам прапанавана спалучаць лекцыйны матэрыял з самастойнай работай над вучэбнай і спецыяльнай літаратурай, а таксама азнаямленнем з творамі сучаснага мастацтва і напісаннем аўтарскіх работ.

**Колькасць акадэмічных гадзін**

| | | | |
|---|---|---|---|
| Факультэт | журналістыкі | | |
| Кафедра | літаратурна-мастацкай крытыкі | | |
| Курс | 3 | | |
| Семестр | 4 | 5 | 6 |
| Лекцыі | 8 | 8 | 8 |
| Семінары | 30 | 48 | 56 |
| КСР | 2 | 4 | 4 |
| Усяго аўдыторных гадзін па дысцыпліне | 40 | 60 | 68 |
| Усяго гадзін па дысцыпліне | 100 | 126 | 140 |
| Курсавая работа | | | + |
| Форма бягучай атэстацыі | Экзамен | Экзамен | Экзамен |
| Форма атрыманай вышэйшай адукацыі | Дзённая | | |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛА

## РАЗДЗЕЛ 1. ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАЯ КРЫТЫКА ЯК ВІД ЛІТАРАТУРНА-ДАСЛЕДЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ.

### ТЭМА 1.1. Месца і роля крытыкі ў творчым і літаратурным працэсах.

Вызначэнне, функцыі і задачы літаратурна-масацкай крытыкі, асаблівасці яе творчага метаду. Інфармацыйная, рэкламная, рэкрэацыйная і забаўляльная функцыі сучаснай крытыкі. Месца і роля крытыкі ў творчым і літаратурным працэсах. Віды літаратурна-мастацкай крытыкі, асаблівасці іх праяўлення ў масавых і спецыялізаваных выданнях. Крытэрыі і прынцыпы ацэнкі публіцыстычных і мастацкіх твораў.

### Тэма 1.2. Асноўныя адрасы літаратурна-мастацкай крытыкі, яе маральна-эстэтычныя высновы.

Крытычнае выказванне ў сістэме літаратурнага факта (літаратурны твор – пасіўнае чытацкае меркаванне (уражанне) – асобнае крытычнае выказванне, увасобленае ў тэксце крытыка – комплекс крытычных выказванняў (тэксты розных крытыкаў). Мастацкая камунікацыя як адна з найважнейшых мэт літаратурна-мастацкай крытыкі. Крытык як пасрэднік паміж чытацкай аўдыторыяй і пісьменніцкай (мастацкай) супольнасцю

### Тэма 1.3. Станаўленне беларускай літаратурна-мастацкай крытыкі.

Асаблівасці крытыкі пісьменніцкай і дзеячаў мастацтва. Беларуская літаратурна-мастацкая крытыка ў 20 – 30-я гг.: творчыя аб'яднанні і іх выданні. М. Багдановіч – крытык. Асноўныя тэмы і жанры выступленняў у друку. Літаратуразнаўчая і крытычная спадчына Івана Замоціна. Творчасць на сумежжы дзвюх культур. Асаблівасці даследчага метаду. С. Палуян – крытык.
Крытычная спадчына М. Гарэцкага.

## РАЗДЗЕЛ 2. ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ ЯК СПЕЦЫФІЧНЫ СПОСАБ КРЫТЫЧНАГА РЭАГАВАННЯ І АКТУАЛІЗАЦЫІ АЎТАРСКАЙ ІДЭІ.

### ТЭМА 2.1. Твор і яго крытычнае вытлумачэнне.

Інтэрпрэтацыйныя падыходы. Праблема ўспрымання ў сучаснай метадалогіі літаратурнай крытыкі. Спосабы аргументацыі ацэнак і вывадаў. Лагічнае і вобразнае ў працэсе аналізу твораў. Аб'ектыўнае і суб'ектыўнае ў крытыцы. Віды мастацтва: вызначэнне, прынцыпы класіфікацыі, спецыфіка іх крытычнага асэнсавання. Асноўныя інтэрпрэтацыйныя тэндэнцыі: імкненне дэшыфраваць тэкст, пошук у тэксце абагульненай ідэі, праблемы, глабальнага прынцыпу.

### Тэма 2.2. Крытыка і іншыя навукі аб мастацкай творчасці, крытыка і публіцыстыка; узаемапранікненне і ўласныя сферы дзейнасці.

Поліварыянтнасць даследчых інтарэсаў сучаснай філалогіі і гуманітарыстыкі.
Выкарыстання метадаў і прыёмаў з разнастайных сумежных галін ведаў і новыя міждысцыплінарныя плоскасці даследавання. Сучасны мастацкі тэкст як засвоены, адаптаваны "сюжэт" адначасова для некалькіх сумежных субдысцыплін, якія ўзніклі ў выніку аб'яднання намаганняў лінгвістаў, літаратуразнаўцаў, гісторыкаў літаратуры, крытыкаў, культуролагаў, філосафаў, мастацтвазнаўцаў. Міждысцыплінарны характар сучаснай

гуманітарыстыкі ў святле непазбежных запазычанняў і трансляцый адных і тых жа “сюжэтаў” з адной дысцыпліны ў іншую.

**Тэма 2.3. Крытыка як самаўсведамленне мастацтва (культуры).**

Крытыка аб выяўленчым мастацтве розных відаў.

Беларуская кінакрытыка і кіназнаўства: станаўленне, развіццё, сучасныя тэндэнцыі. Мызычнае мастацтва і крытыка: разнавіднасці формаў і спецыфіка іх асэнсавання. Традыцыі і сучасны стан беларускай тэатральнай крытыкі. Ю.М. Лотман аб навуцы, мастацтве, культуры. (Артыкулы: “Как говорит искусство”, “Этот трудный текст”, “История культуры: движение в будущее”, “О природе искусства”, “Архитектура в контексте культуры”, “Память культуры. История и семиотика”, “Семиотика кино и пробемы киноэстетики”, “К построению теории взаимодействия культур”).

## РАЗДЗЕЛ 3. З ГІСТОРЫІ РАЗВІЦЦЯ ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАЙ КРЫТЫКІ

**Тэма 3.1. Асноўныя напрамкі гісторыі развіцця рускай літаратурна-мастацкай крытыкі.**

Светапогляд В.Р. Бялінскага ў 1840-я гады і яго трактоўка мастацкай літаратуры. Бялінскі аб прызначэнні крытыкі. (“Ідэя мастацтва” Бялінскага). Барацьба ідэйных плыняў у крытыцы і журналістыцы ў 1859 – 1862 гг. Эстэтычная канцэпцыя М.Г. Чарнышэўскага (“Эстетические отношения искусства к действительности”, аўтарэцэнзія). “Рэальная крытыка” М. А. Дабралюбава і стаўленне да яе ў розныя гістарычныя перыяды. М. Цвятаева аб сэнсе і ролі крытыкі.

**Тэма 3.2. Крытэрыі і прынцыпы ацэнкі публіцыстычных і мастацкіх твораў**.

Перагляд традыцыйных прынцыпаў і крытэрыяў эстэтычнай ацэнкі. Заканамернае звужэнне грамадскай функцыі крытыкі. Папулярызацыя ў крытыцы прынцыпу “мастацтва дзеля мастацтва”. Дыскрэдытацыя ў чытацкіх колах наіўнага ўяўлення пра надзвычайную грамадскую ролю крытыкі як камертона ў бягучым літаратурным працэсе. Узнікненне з’явы, якую можна акрэсліць як *“расплывістасць (амбівалентнасць) меркаванняў”*, што паўстала сёння не толькі перад крытыкамі, але і літаратуразнаўцамі.

**Тэма 3.3. Аб’ектыўнае і суб’ектыўнае ў крытыцы.**

Дыялектыка аб’ектыўнага і суб’ектыўнага пачаткаў у крытыцы. Суб’ектыўна-аб’ектыўны, устойліва-зменлівы, інварыянтна-варыятыўны, “дакладна”-шматзначны характар прачытання і ацэнкі твора літаратурна-мастацкай крытыкай. Для пісьменніка літаратурны твор мае перш за ўсё суб’ектыўны сэнс: ён з’яўляецца рэалізацыяй пэўнага творчага праекта, задумы або – у больш шырокім сэнсе – артыкуляцыяй яго суб’ектыўнасці. Аднак, з пункту гледжання чытача, літаратурны твор мае аб’ектыўны сэнс, а, значыць, выступае ў якасці аб’екта, прызначанага для спасціжэння і вытлумачэння.

## РАЗДЗЕЛ 4. ІДЭАЛАГІЧНЫ ХАРАКТАР ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАЙ КРЫТЫКІ

**Тэма 4.1. Ідэалагічны характар літаратурна-мастацкай крытыкі.**

Мастацкая культура як адна з галінаў грамадскай свядомасці. Сувязь мастацкай культуры з сацыяльнымі інтарэсамі ў грамадстве ў дадзены гістарычны момант. Літаратурна-мастацкая крытыка як галіна мастацка-эстэтычнага ўсведамлення. Ідэалагічны ўзровень як вызначальнік літаратурна-мастацкай крытыкі. Выяўленне крытыкай мастацка-эстэтычных поглядаў грамадства. Цесная сувязь літаратурна-мастацкай крытыкі з іншымі відамі грамадскай свядомасці: палітыкай, мараллю, сацыялогіяй, псіхалогіяй, філасофіяй. Сінтэтычная прырода мастацкага твора – прычына сувязі літаратурна-мастацкай крытыкі з іншымі бакамі духоўнага свету.

**Тэма 4.2. Месца крытыкі ў мастацкай культуры**

Паняцце мастацкай культуры і яе элементаў. Прыналежнасць крытыкі да спецыялізаваных інстытутаў свету мастацкай культуры. Задачы крытыкі, якія выцякаюць з яе прыналежнасці. Свабода выбару мастака і публікі. Гісторыя ўзнікнення прафесійнай крытыкі. Пісьменніцкая крытыка і яе спецыфіка. Прафесійная крытыка як выяўленне грамадскага меркавання пра культуру і, адначасова, – праваднік інтарэсаў мастацтва ў публіцы.

**Тэма 4.3. Навукова-публіцыстычная прырода крытычнай дзейнасці**

Аналіз і ацэнка мастацкага твора – прадмет дзейнасці мастацтвазнаўства і крытыкі. Адрозненні мастацтвазнаўчага і крытычнага падыходаў. Узаемазалежнасць літаратурна-мастацкай крытыкі ад літаратуразнаўства і публіцыстыкі. Адрозненні крытыкі ад навукі пра літаратуру. Публіцыстычнасць крытыкі, яе разнастайныя праявы ў рэальнай крытычнай дзейнасці. Прырода крытычнай дзейнасці як складаная арыгінальная еднасць навуковасці і публіцыстычнасці.

**Тэма 4.4. Арыентаванасць літаратурна-мастацкай крытыкі на рэцыпіента**

Асноўная асаблівасць грамадскай публіцыстычнай дзейнасці крытыкі – арыентаванасць на публіку. Негатыўныя асаблівасці арыкнтаванасці літаратурна-мастацкай крытыкі: крытыка як рэкламны занятак па-за аб’ектыўным аналізам вартасцей твора, крытыка, якая перайшла на пазіцыі навукі, адарваная ад грамадскай рэчаіснасці. Праявы публіцыстычнасці крытыкі.

**Тэма 4.5. Арыентаванасць літаратурна-мастацкай крытыкі на мастака**

Крытыка як рэальная правамоцная сіла, што ўздзейнічае на стваральнікаў мастацкіх каштоўнасцей. Схаваны і адкрыты дыялог крытыка з мастаком. Падвойная задача крытычнай дзейнасці – уздзеянне на публіку і мастака. Залежнасць адрасаванасці крытыкі ад канкрэтных задач, што стаяць перад крытыкам.

**Тэма 4.6. Літаратурна-мастацкая крытыка як соеасаблівы від мастацкай творчасці**

Адрозненне крытыкі ад навуковай і публіцыстычнай дзейнасці. Погляды на крытыку як на асаблівы від літаратурнай творчасці. Адрозненні паміж крытыка-

аналітычнымі і ствральна-мастацкімі здольнасцямі. Адрозненні крытыкі ад мастацкай творчасці. Розныя мэты творчай дзейнасці пісьменніка і крытыка. Выкарыстанне крытыкай элементаў мастацкасці.

**Тэма 4.7. Мастацкасць крытыкі. Крытыка пісьменніцкая і прафесійная**

Агульныя рысы крытыкі пісьменніцкай і прафесійнай, іх адрозненні. Розная ступень і прырода суб'ектыўнасці ў крытычнай творчасці пісьменніка і прафесійнага крытыка. Цэласна-непасрэдны характар вобразнасці ў крытычных работах пісьменніка. Уласцівасці прафесійнай крытыкі, выкарыстанне ў пісьменніцкай і прафесійнай крытыцы вобразнага пачатку.

**Тэма 4.8. Вобразна-мастацкій і логіка-паняційныя пачаткі ў крытыцы**

Лагічнае і эмацыйнае ўздзеянне крытычнай вобразнасці. Спецыфічныя асаблівасці выкарыстання вобразнасці ў літаратурна-мастацкай крытыцы. Рысы мастацкасці крытыкі, якія звязаны з яе функцыянаваннем пераважна ў сродках масавай інфармацыі.

**Тэма 4.9. Правамернасць розных крытычных прачытанняў**

Прычыны разнастайных крытычных прачытанняў мастацкага твора. Агульныя заканамернасці працэсу адлюстравання, што дзейнічаюць у крытычнай дзейнасці. Асаблівая прырода мастацкага адлюстравання рэчаіснасці і творах мастацтва. Аб'ект даследавання літаратурна-мастацкай крытыкі і яго суб'ектыўна-аб'ектыўны характар. Шматзначнасць твораў мастацтва і магчымасць іх разнастайнага прачытання. Праблема сучаснай інтэрпрэтацыі класічных твораў мастацтва.

**Тэма 4.10. Дыялектыка аб'ектыўнага і суб'ектыўнага ў крытычнайтворчасці**

Дыяхронны і сінхронны крытычны аналіз. Складанасць навуковай метадалогіі крытычнага аналізу. Асновы крытычнага аналізу. Адрозненне непаўнаты мастацкасці ад непаўнаты жыццёвай. Даследаванне комплексу сістэмы вобразаў, спецыфікі жанравых і стылёвых форм. Крайнасці крытычнага прачытання – экспрэсіянісцкая, суб'ектывісцкая і дагматычная крытыка. Крытэрый ісціннасці крытычнага меркавання – практыка. Аргументацыя як аснова пераходу суб'ектыўнасці ў аб'ектыўнасць. Патрабаванні ў аргументацыі.

**Тэма 5.1. Жанры літаратурна-мастацкай крытыкі. Рэцэнзаванне**

Рэцэнзія як першасны жанр літаратурна-крытычнай дзейнасці. Адрозненні ад навуковага рэцэнзавання. Эстэтычная прырода рэцэнзіі. Варыянты ўспрымання твора мастацтва. Тыпалагічныя рысы і асаблівасці рэцэнзіі. Асаблівасці рэцэнзавання ў спецыялізаваных выданнях па літаратуры і мастацтву. Успрымальнасць рэцэнзіі да іншых публіцыстычных жанраў.

**Тэма 5.2. Жанры літаратурна-мастацкай крытыкі. Крытычны артыкул.**

Крытычны артыкул як найбольш распаўсюджаны жанр літаратурна-мастацкай крытыкі. Задачы артыкула. Сучасная актуальная праблема як цэнтр любога крытычнага артыкула. Суадносіны абагульненасці і канкрэтнага аналізу. Навуковасць артыкула. Крытэрыі разрознення артыкулаў. Праблемны артыкул як распаўсюджаная разнавіднасць жанру. Кампазіцыйная пабудова артыкула, звязаная са спецыфікай і характарам аргументацыі.

**Тэма 5.3. Жанры літаратурна-мастацкай крытыкі. Творчы партрэт**

Жанр творчага партрэта як крытычны аналіз індывідуальнасці мастака, манаграфічная партрэтная характарыстыка. Аб’екты даследавання ў жанры творчага партрэта. Крытэрыі выдзялення разнастайнасцей жанру творчага партрэта. Асноўныя тыпы жанру, іх асаблівасці і адрозненні. Спецыфіка антрапалагічнага падыходу.

**Тэма 5.4. Напісанне літаратурна-крытычнага агляду**

Асаблівасці жанру літаратурна-крытычнага агляду. Яго узаемасувязь з іншымі асноватворнымі жанрамі літаратурна-мастацкай крытыкі. Праявы жанру на старонках масавых выданняў і спецыялізаваных. Адрозненні ад рэцэнзіі і крытычнага і праблемнага артыкулаў.

**Тэма 5.5. Праявы суб’ектыўнасці і межы суб’ектыўнасці**

Залежнасць якасці крытычнага твора ад індывідуальна развітага эстэтычнага пачуцця ў крытыка. Магчымасць нязгоды аўтара з крытычнай інтэрпрэтацыяй свайго твора. Набліжанасць духоўнага свету крытыка да духоўнага свету мастака як умова, якая судзейнічае пранікненню ў мастацкі свет твора.

**Тэма 5.6. Праблемы крытычнага майстэрства.**

Задача крытыка – аналіз твора як мастацкага цэлага, пошук існуючых заканамернасцей у творы. Выкарыстанне крытыкай канкрэтна-мастацтвазнаўчага апарата паняццяў і катэгорый. Адрозненне крытыкі ад навуковай дзейнасці, асаблівасці выкарыстання асноўных прынцыпаў навуковага даследавання ў крытычнай дзейнасці: гістарызм, аналіз мастацкіх твораў у адзінстве формы і зместу, выяўленне творчай індывідуальнасці мастака.

**Тэма 5.7. Некаторыя практычныя прыёмы крытычнага аналізу**

Унутраная логіка і адзінства руху думкі ў крытычным творы. Значэнне змястоўнасці зачыну, разгорнутых разваг, аналогій з іншымі галінамі мастацтва і жыцця. Стыль крытычнага аналізу, яго набліжанасць да паўсядзённай мовы, залежнасць крытычнага стылю ад асаблівасцей мастацкай мовы твора, які аналізуецца.

**Тэма 5.8. Твор – Аўтар. Мастацкі працэс як аб’ект крытыкі**

Пачатак работы крытыка – аналіз мастацкага твора. Працэс аналізу мастацкага твора і асноўныя этапы крытычнай работы. Крытычны аналіз творчасці мастака. Значэнне вывучэнн актыўнага сацыяльнага фону творчага працэсу мастака. Адрозненне крытычнага аналізу ад навуковага. Крытычнае вывучэнне творчага працэсу – задача найвышэйшай складанасці для крытыка.

**Тэма 5.9. Літаратурна-мастацкая крытыка ў сістэме сродкаў масавай інфармацыі**

Функцыянаванне крытыкі ў агульным кантэксце працы СМІ. Грамадскі сэнс крытычнай дзейнасці. Уласцівасці крытыкі, абумоўленыя СМІ. Роля крытыкі ў стварэнні прэстыжнасці культурных з’яў. Крытыка як неад’емная частка перыядычных выданняў, яе роля ў іх. Актуальныя праблемы сучаснай літаратуры і задачы крытыкі. Узаемасувязь літаратуразнаўства і літаратурна-мастацкай крытыкі.

**Тэма 5.10. Агляд студэнцкіх літаратурна-крытычных работ**

Выяўленне літаратурна-крытычнага мыслення, зафіксаванага ў студэнцкіх працах. Дыскусія наконт вартасцей і недахопаў крытычнага тэксту. Спробы вырашэння праблемных момантаў змястоўнага і кампазіцыйнага рашэння.

## Характарыстыка курсавой работы

Асноўнай мэтай курсавой работы па дысцыпліне «Літаратурна-мастацкая крытыка» (6-ы семестр) з'яўляецца далейшае фарміраванне ў студэнтаў навыкаў навукова-даследчай дзейнасці. Курсавая работа з'яўляецца кваліфікацыйным вынікам гэтай дзейнасці, які складаецца з самастойнага асэнсавання пастаўленай праблемы.

Курсавая работа ўяўляе навуковы тэкст, дзе акрэслены асноўныя тэарэтычныя падыходы да праблематыкі, якая даследуецца. Курсавая работа павінна паказаць уменне студэнтаў працаваць з навуковай літаратурай і рабіць на аснове яе вывучэння высновы і абагульненні, самастойна выкласці праблему, выявіць найбольш актуальныя пытанні, прадставіць уласныя эмпірычныя дадзеныя.

Курсавая работа не можа быць простай кампіляцыяй і складацца з разнастайных фрагментаў артыкулаў і манаграфій. Яна павінна стаць завершаным навуковым даследаваннем, змяшчаць факты і дадзеныя, якія раскрываюць узаемасувязь паміж з'явамі, працэсамі, аргументамі, дзеяннямі, а таксама мець пэўную ступень навізны, абагульняць шырокі корпус літаратуры і матэрыялы эмпірычных даследаванняў, у якіх выяўляецца аўтарскае бачанне праблемы і яе вырашэнне. Гэтаму агульнатэарэтычнаму палажэнню падпарадкоўваецца структура курсавой работы, яе мэта, задачы, методыка даследавання і высновы.

Курсавая работа выконваецца на тэму «Крытыка і іншыя навукі аб мастацкай творчасці, крытыка і публіцыстыка; узаемапранікненне і ўласныя сферы дзейнасці». Студэнты маюць права свабодна абіраць эмпірычны матэрыял, на аснове якога будуць праводзіць даследаванне праблемы суіснавання крытыкі і іншых мастацтвазнаўчых дысцыплін.

Да курсавога даследавання прад'яўляюцца патрабаванні, характэрныя для такога віду работ: структураванне на часткі і раздзелы з падрабязным выкладаннем тэарэтычнага і практычнага матэрыялу; падрыхтоўка ўводзін з пазначэннем мэты, задач, аб'екта, прадмета і метадаў даследавання; заключэння з асноўнымі высновамі, а таксама спіса выкарыстанай літаратуры. Аб'ём курсавога даследавання – 25-35 старонак (да спіса літаратуры). На падрыхтоўку курсавога даследавання адводзіцца 40 гадзін.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА

| **Нумар раздзела, тэмы** | **Назва раздзела, тэмы** | **Количество аудиторных часов** | | | | | **Колькасць гадзін ВСР** | **Форма контролю ведаў** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | **Лекцыі** | **Практ. заняткі** | **Семінар. заняткі** | **Лабарат. заняткі** | **Іншае** | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1. | Месца і роля крытыкі ў творчым і літаратурным працэсах. | 2 | | | | | | |
| 2. | Асноўныя адрасы літаратурна-мастацкай крытыкі, яе маральна-эстэтычныя высновы. | 2 | | | | | | |
| 3. | Станаўленне беларускай літаратурна-мастацкай крытыкі. | 2 | | | | | | |
| 4. | Твор і яго крытычнае вытлумачэнне. | 2 | | | | | | |
| 5. | Крытыка і іншыя навукі аб мастацкай творчасці, крытыка і публіцыстыка; узаемапранікненне і ўласныя сферы дзейнасці. | 2 | | | | | | |
| 6. | Крытыка як самаўсведамленне мастацтва (культуры). | 2 | | | | | | |

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Количество аудиторных часов | | | | | Колькасць гадзін ВСР | Форма контролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практ. заняткі | Семінар. заняткі | Лабарат. заняткі | Іншае | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 7. | Асноўныя напрамкі гісторыі развіцця рускай літаратурна-мастацкай крытыкі. | 2 | 2 | | | | | Дыскусія |
| 8. | Крытэрыі і прынцыпы ацэнкі публіцыстычных і мастацкіх твораў. | 2 | 6 | | | | | Дыскусія |
| 9. | Аб’ектыўнае і суб’ектыўнае ў крытыцы. | 2 | 6 | | | | | Вуснае апытванне |
| 10. | Літаратурна-мастацкая крытыка як грамадская з’ява | 2 | 6 | | | | | Вуснае апытанне, дыскусія |
| 11. | Месца крытыкі ў мастацкай культуры | | 6 | | | | | Вуснае апытанне, дыскусія |
| 12. | Навукова-публіцыстычная прырода крытычнай дзейнасці | | 6 | | | | | Вуснае апытанне, дыскусія |
| 13. | Арыентаванасць літаратурна-мастацкай крытыкі на рэцыпіента | | 6 | | | | | Вуснае апытанне, дыскусія |
| 14. | Арыентаванасць літаратурна-мастацкай 6крытыкі да мастака6 | | 6 | | | | | Вуснае апытанне, дыскусія |

| Нумар раздзел а, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Количество аудиторных часов | | | | | Колькасць гадзін ВСР | Форма контролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практ. заняткі | Семінар. заняткі | Лабарат. заняткі | Іншае | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 15. | Літаратурна-мастацкая крытыка як соеасаблівы від мастацкай творчасці | | 6 | | | | | Вуснае апытанне, дыскусія |
| 16. | Мастацкасць крытыкі. Крытыка пісьменніцкая і прафесійная | | 6 | | | | | Работа ў групах, разгляд творчых работ |
| 17. | Вобразна-мастацкій і логіка-паняційныя пачаткі ў крытыцы | | 6 | | | | | Работа ў групах, разгляд творчых работ |
| 18. | Правамернасць розных крытычных прачытанняў | | 6 | | | | | Работа ў групах, разгляд творчых работ |
| 19. | Дыялектыка аб'ектыўнага і суб'ектыўнага ў крытычнай творчасці | | 6 | | | | | Работа ў групах, разгляд творчых работ |
| 20. | Жанры літаратурна-мастацкай крытыкі. Рэцэнзаванне. | | 6 | | | | | Работа ў групах, разгляд творчых работ |
| 21. | Жанры літаратурна-мастацкай крытыкі. Крытычны артыкул. | | 6 | | | | | Работа ў групах, разгляд творчых работ |
| 22. | Жанры літаратурна-мастацкай крытыкі. Творчы партрэт. | | 6 | | | | | Вуснае апытанне, дыскусія |

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Количество аудиторных часов | | | | | Колькасць гадзін ВСР | Форма контролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практ. заняткі | Семінар. заняткі | Лабарат. заняткі | Іншае | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 23. | Напісанне літаратурна-крытычнага агляду | | 6 | | | | | Вуснае апытанне, дыскусія |
| 24. | Праявы суб’ектыўнасці і межы суб’ектыўнасці | | 6 | | | | | Работа ў групах |
| 25. | Праблемы крытычнага майстэрства | | 6 | | | | 2 | Разгляд творчых работ |
| 26. | Некаторыя практычныя прыёмы крытычнага аналізу | | 6 | | | | 2 | Разгляд творчых работ |
| 27. | Твор – Аўтар. Мастацкі працэс як аб’ект крытыкі | | 6 | | | | 2 | Абарона рэфератаў |
| 28. | Літаратурна-мастацкая крытыка ў сістэме сродкаў масавай інфармацыі | | 6 | | | | 2 | Абарона рэфератаў |
| 29. | Агляд студэнцкіх літаратурна-крытычных работ | | 6 | | | | 2 | Абарона творчых работ |
| | **Разам** | **24** | **134** | | | | **10** | |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ
# РЭКАМЕНДУЕМАЯ ЛІТАРАТУРА

## Асноўная літаратура


1. Аймермахер К. Знак. Текст. Культура. — М.: Дом интеллектуальной книги, 1997. — 244 с.
2. Бахтин М.М. Эстетика словесного творчества. М.: Искусство, 1979.
3. Беларуская крытыка і літаратуразнаўства (20 – 30 г.): Метадычныя парады па курсе "Гісторыя беларускай літаратурнай крытыкі" для студэнтаў спецыяльнасці ГО201 – Беларуская мова і літаратура / Гродзен. дзярж. ун-т імя Я. Купалы; Склад. І.В. Жук. Гродна: ГрДУ, 1997.
4. Е.Л. Бондарева. Литературно-художественная критика. Часть 1. БГУ, 1987.
5. Е.Л. Бондарева. Литературно-художественная критика. Основы теории. Часть 2. БГУ, 1994.
6. Е.Л. Бондарава. Беларуская літаратурна-мастацкая крытыка: пачатак і станаўленне. Частка 3. БДУ, 1997.
7. Е.Л. Бондарева. Экран в разных измерениях (разделы о киноведении и кинокритике). Мн., 1983.
8. В.Н. Баранов, А.Г. Бочаров, Ю.Н. Суровцев. Литературно-художественная критика. М.: Высшая школа, 1982.
9. Васючэнка П. Адлюстраванне першатвору. – Мн., 2004.
10. Виды литературно-художественной критики: опыт историко-теоретического обзора: Сб. науч. ст. / Под общ. ред. Л.П. Саенковой. Мн.: БГУ, 2005.
11. Гніламёдаў У. Класікі і сучаснікі: Артыкулы, нарысы, старонкі ўспамінаў. Мн.: Мастацкая літаратура, 1987.
12. Грамадчанка Т.К., Гурская А.С., Гарэлік Л.М. Праблемы сучаснай беларускай крытыкі. Мн.: Навука і тэхніка, 1996.
13. Задорнова В.Я. Восприятие и интерпретация художественного текста. М.: Высшая школа, 1994.
14. Замоцін І.І. Творы: літаратурна-крытычныя артыкулы. Мн.: Мастацкая літаратура, 1991.
15. В.Н. Кулешов. История русской критики XVIII – начала XX веков. Изд. 4. М.: Просвещение, 1991.
16. Литературный энциклопедический словарь / Под общ. ред. В.М. Кожевникова, П.А. Николаева. М.: Советская энциклопедия, 1987.
17. Лотман Ю.М. Воспитание души: Воспоминания. Интервью. Беседы о русской культуре. СПб.: Искусство – СПб, 2005.
18. Лотман Ю.М. О поэтах и поэзии: Анализ поэтического текста. Статьи. Исследования. Заметки. СПб.: Искусство – СПБ, 2001.
19. Міхась Мушынскі. Каардынаты пошуку. Беларуская крытыка: набыткі, перспектывы. Мн.: Мастацкая літаратура, 1988.
20. Н.Т. Нефедов. История зарубежной критики и литературоведения. М.: Высшая школа, 1988.

21. Віктар Каваленка. Праблемы сучаснай беларускай крытыкі. Мн.: Навука і тэхніка, 1977.
22. Б.В. Стральцоў. Асноўныя творчыя метады ў журналістыцы. Мн., БДУ, 1999–2000.
23. Теории, школы, концепции: (Критич. анализы). Художественная рецепция и герменевтика: Сб. ст. / АН СССР. Ин-т мировой лит. им. А.М. Гоького; Отв. ред. Ю.Б. Борев. М.: Наука, 1985.
24. Тынянов Ю.Н. Литературный факт. М.: Высшая школа, 1993.
25. Храпченко М.Б. Познание литературы и искусства. Теория. М.: Наука, 1987.
26. Сергей Чупринин. Критика – это критики. М.: Советский писатель, 1988.
27. Эпштейн. М.Н. Литературное произведение и его критическое истолкование // Актуальные проблемы методологии литературной критики: Принципы и критерии: Сб. ст. / АН СССР. Ин-т мировой лит. им. А.М. Горького; Редкол.: Г.А. Белая (отв. ред.) и др. М.: Наука, 1980. С. 302—320.

**Дадатковая літаратура**

1. Андреев Ю. Волшебное зрение (специфика литературы в современных преломлениях). — Л.: Советский писатель. Ленинградское отделение, 1990. — 432 с.
2. Аристотель. Поэтика. Риторика. СПб.: Азбука, 2000.
3. Вежбицкая А. Язык. Культура. Познание. — М.: Русские словари, 1997. — 416 с.
4. Гинзбург Л. О лирике. М.: Интрада, 1997.
5. История культуры и поэтика. М.: Изд-во “Наука”, 1994.
6. Кавалеўскі А. “Адчуць нявыказанае” (развагі аб інтэрпрэтацыі паэтычнага тэксту) // Слова ў кантэксце часу: да 80-годдзя д-ра філал. навук, праф. Аркадзя Іосіфавіча Наркевіча: зб. навук. прац / пад агульн. рэд. д-ра філал. навук, праф. В.І. Іўчанкава. — Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2009. — С. 200–210.
7. Кавалеўскі А. Крытычнае меркаванне аб творы як спосаб мастацкай камунікацыі // Журналистика. Искусство. Критика: Материалы научно-практ. конф., посвященной 85-летию со дня рожд. известного белорусского кинокритика, доктора филол. наук, профессора, Заслуженного деятеля науки Беларуси Ефросиньи Леонидовны Бондаревой. — Минск, 2008. — С. 69—74.
8. Кавалеўскі А. Слова “з нагоды” *Слова*, альбо статус рэцэнзіі ў сучасным літаратурным працэсе // Жыццём і словам прысягаючы...: да 85-годдзя заслуж. работніка адукацыі Рэсп. Беларусь, д-ра філал. навук, праф. Міхася Яўгенавіча Цікоцкага: зб. навук. прац / пад агульн. рэд. д-ра філал. навук, праф. В.І. Іўчанкава. — Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2007. — С. 127–134.
9. Кавалеўскі А.М. Чытацкі вопыт: асаблівасці ўспрымання і інтэрпрэтацыі мастацкага тэксту // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Сер. 4: Філал. Журн. Пед. — 2007. — № 1. — С. 122–128.
10. Кавалеўскі А. Чытаць – успрымаць – разумець // Тэксты — №12. — Мінск, 2009. — С. 75 – 101.
11. Лотман Ю.М. Избранные статьи: В 3 т. Таллинн: Изд-во “Александра”, 1992.
12. Мукаржовский Я. Исследования по эстетике и теории искусства. М.: Искусство, 1994.

13. Штайн К.А. Язык. Поэзия. Гармония.Ставрополь: Ставропольское книжное изд-во, 1989.
14. Вячаслаў Рагойша. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах. Мн.: Беларуская энцыклапедыя, 2001.
15. Сартр Ж.П. Что такое литература? Слова. Мн.: Попурри, 1999.
16. Томашевский Б.В. Теория литературы. Поэтика. М.: Аспект пресс, 2003.
17. І.П. Мележ. Развагі пра нашу крытыку. У зб. “Жыццёвыя клопаты”. Мн.: Мастацкая літаратура, 1975.

**Для дыягностыкі кампетэнцыі выкарыстоўваюцца наступныя формы:**

1. Вусная форма.
2. Пісьмовая форма.
3. Вусна-пісьмовая форма.

Да вуснай формы дыягностыкі кампетэнцыі адносіцца:

1. Вуснае апытанне.
2. Дыскусія.
3. Работа ў групах.

Да пісьмовай формы дыягностыкі адносяцца:

1. Індывідуальная праверка (кантрольныя апытанні).

Да вусна-пісьмовай формы дыягностыкі адносяцца:

1. Абарона рэфератаў.
2. Абарона творчых работ.

**Пералік заданняў для КСР.**

У якасці заданняў для КСР студэнтам прапаноўваецца рэферат і творчая работа па тэмам:

1. Праблема крытычнага майстэрства.
2. Некаторыя практычныя прыёмы крытычнага аналізу.
3. Твор-Аўтар. Мастацi працэс як аб’ект крытыкі.
4. Літаратурна-мастацкая крытыка ў сістэме СМІ.
5. Агляд студэнцкіх літаратурна-мастацкіх работ.

# ПРАТОКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ УВА

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб змяненнях у змесце вучэбнай праграмы паводле дысцыпліны, якая вывучаецца | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала праграму (дата, № прат.) |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Тэорыя літаратуры | Кафедра літаратурна-мастацкай крытыкі | Прапаноў няма | Заўваг няма Пратакол № 18 ад 29.06.2016 |
| Беларуская літаратура | Кафедра літаратурна-мастацкай крытыкі | Прапаноў няма | Заўваг няма Пратакол № 18 ад 29.06.2016 |
| Замежная літаратура | Кафедра замежнай літаратуры і журналістыкі | Прапаноў няма | Заўваг няма Пратакол № 14 ад 17.06.2016 |
| Культуралогія | Кафедра літаратурна-мастацкай крытыкі | Прапаноў няма | Заўваг няма Пратакол № 18 ад 29.06.2016 |
| Руская літаратуры | Кафедра літаратурна-мастацкай крытыкі | Прапаноў няма | Заўваг няма Пратакол № 18 ад 29.06.2016 |

**ДАПАЎНЕННІ І ЗМЕНЫ ДА ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ УВА**

| № пп | Дапаўненні і змяненні | Падстава |
|---|---|---|
| | | |

Вучэбная праграма перагледжана і адобрана на пасяджэнні кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі (пратакол № __от ______________ 201_ г.)

Загадчыцай кафедры ______________ Л.П. Саянкова

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дэкан факультэта
кандыдат філалагічных навук, дацэнт ______________ С.В.Дубовік